ШТО ЧАКАЕ ГАРАДЗЕНСКІ «НОВЫ СВЕТ»,

альбо Як знайсці кампраміс паміж гістарычнымі каштоўнасцямі і нармальнымі ўмовамі жыцця?

На электронный пошце рэдакцыя «Звязды» атрымала ліст з Польшчы. Казімеж Нехвядовіч (sobotniki@poczta.onet.pl) прыводзіць публікацыю ў газеце «Rzeczpospolita» пад назвай «Барацьба за гарадзенскі «Новы свет». У артыкуле гаворыцца, што быццам улады Гродна маюць намер разбурыць каля двухсот будынкаў у гэтым квартале, супраць чаго пратэстуюць гісторыкі. «Ці магла б ваша газета выказацца па гэтай вельмі важнай справе?» — пытаецца спадар Нехвядовіч.

Наш карэспандэнт (дарэчы, аўтар артыкула «Прагулка па «Новым свеце», які «Звязда» надрукавала летась) паспрабаваў гэта зрабіць. Не прэтэндуючы, як кажуць, на ісціну ў апошняй інстанцыі, а абапіраючыся на меркаванні людзей, якія так ці інакш маюць дачыненне альбо інтарэс да гэтай тэмы.

— У непаўторных рысах адзінага гісторыка-культурнага ансамбля можна ўбачыць розныя архітэктурныя напрамкі і стылі, — зазначае аўтар кнігі «Новы свет і яго наваколле» **гісторык Андрэй ЧАРНЯКЕВІЧ** і запрашае на прагулку па гэтым раёне.

Спыняемся каля будынка з чатырма калонамі на вуліцы Рэйманта, пабудаванага ў 30-х гадах мінулага стагоддзя.

— Гэта тыповы будынак для свайго часу, кажучь, што тут жыў вайсковец. І менавіта таму, што такіх у Гародні толькі два (яшчэ адзін на вуліцы Мядовай), ён становіцца элітарнай рэччу, бо адлюстроўвае архітэктурную ідэю мінулай эпохі, — лічыць Андрэй Чарнякевіч.

Потым ён распавядае пра асаблівасці заходнебеларускага канструктывізму 1920—30-х гадоў у жыллёвым будаўніцтве (на вуліцах Розы Люксембург, Славацкага і 17 Верасня), паказвае пабудаваныя на пачатку мінулага стагоддзя драўляныя дамы, дзе жылі расійскія чыноўнікі:

— Звярніце ўвагу на гэтыя прыгожыя драўляныя канькі ў расійскім стылі «мадэрн». Прыязджала гісторык архітэктуры з Вільні — вельмі ўзрушана пра іх казала. А ці бачылі вы дзверы з такім дэкорам?

Так, яны не ў лепшым стане. Але ж людзі, якія ў гэтым доме цяпер жывуць, не мяняюць іх на сучасныя. Пэўна, гісторыя, памяць — гэта не проста словы.

Але не толькі рознымі архітэктурнымі напрамкамі і дэкаратыўнымі элементамі мінулай эпохі (аздабленне вокнаў, дзверы, дэкор фасадаў) вызначаецца аблічча «Новага свету». Асобная і не менш цікавая тэма, якую, дарэчы, можна таксама выкарыстаць у мэтах гістарычнай адукацыі і турызму — людзі, што пражывалі ў гэтым квартале.

— На гэтым доме, як бачыце, няма мемарыяльнай дошкі, але менавіта тут у 1930-х гадах жыў на кватэры заснавальнік музея прыроды Станіслаў Жыўна, — расказвае Андрэй Чарнякевіч. — Непадалёк жылі стваральнік заапарка Ян Каханоўскі, маці Алешы — аўтара «Трох таўстуноў». Захаваўся і будынак, дзе жыў генерал Кайгародаў, які адыграў даволі трагічную ролю ў абароне Гародні ў 1914—1915 гадах...

> **ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА.**
> *На сучасных картах горада над Нёманам квартала ці, кажучы па-сучаснаму, мікрараёна пад назвай «Новы свет» (паміж вуліцамі Горкага і Ажэшкі, літаральна побач з гістарычным цэнтрам) не існуе. Аднак у экспазіцыі Дома-музея Максіма Багдановіча можна ўбачыць канверт з такім адрасам: «гор. Гродна, Новы свет, дом Агульнікава». Гэты канверт (у ім былі ноты для ігры на фартэпіяна) маці паэта Марыя Апанасаўна атрымала з Пецярбурга. Адам Ягоравіч Багдановіч месца жыхарства сваёй сям'і пасля пераезду ў Гродна ў 1892 годзе таксама звязвае з Новым светам: «Жылі мы на ўскраіне горада, на Новым свеце па Садовай, займалі кватэру ў апошнім доме злева...»*
> *Першыя пабудовы ў гэтым квартале з'явіліся ў 1770-х гадах пры гарадзенскім старасце Антоніі Тызенгаўзе, а найбольш актыўна ён пачаў развівацца напрыканцы XIX стагоддзя. У 20—30-х гадах мінулага стагоддзя, калі горад быў у складзе Польшчы, тут будуюцца драўляныя і мураваныя дамы ў стылі канструктывізму, які імкнецца да стварэння зручнага і камфортнага жылля.*



Цікава і тое, што на цаглінах шэрагу размешчаных у гэтым раёне мураваных будынкаў па сёння захаваліся зробленыя на пачатку і ў 30-х гадах мінулага стагоддзя надпісы — салдатаў рускіх, польскіх і савецкіх, дзіцячыя. Быццам урыўкі з гарадзенскай кнігі пра тагачаснае жыццё, «музей графіці» пад адкрытым небам.

Аднак ёсць у «Новым свеце» і, так бы мовіць, другая праўда.

— «Новы свет» — гэта комплекс забудоў з XIX стагоддзя па 30-я гады XX стагоддзя. Дык якой жа каштоўнасцю валодаюць нашы трухлявыя баракі 1954 года зборкі? — напісала ў газету «Вечерний Гродно» **Раіса Аркадзьеўна ЛАГІНОЎСКАЯ**. — Дарэчы, знос іх планаваўся яшчэ 65-м, 72-м і ў 80-я гады мінулага стагоддзя... Ванны няма, прыбіральня ў двары. У 1978 годзе ў дамах па вуліцы праводзілі цэнтральнае ацяпленне, думалі зрабіць перапланіроўку і ўсталяваць санвузел. Але ад гэтай задумы былі вымушаны адмовіцца, паколькі дамы маглі абрушыцца з-за зносу больш чым на семдзясят працэнтаў...

Дык што ж гэта: гістарычная каштоўнасць ці ганьба горада?

— Так, адно — гэта разважаць аб архітэктурных дэталях, гістарычных каштоўнасцях, а іншая рэч — умовы жыцця канкрэтных людзей, — зазначае Андрэй Чарнякевіч. — Як пачынаеш займацца толькі архітэктурай — забываюцца людзі. Як пачынаеш казаць пра нейкія патрэбы людзей — забываецца архітэктура. Тое, што піша ў лісце гэта жанчына, — праблема, якая існуе. Сапраўды, большасць будынкаў на вуліцы Рэйманта і асабліва на вуліцы Славацкага не вельмі прытульныя. За выключэннем тых асабнякоў, якія ўжо перапрацаваныя і часткова страцілі сваю аўтэнтычнасць, па сутнасці гэта халупы і баракі. Прынамсі тыя, якія былі пабудаваныя ўжо пасля Другой сусветнай вайны. Насамрэч гэтыя дамы не з'яўляюцца ніякай каштоўнасцю. Але, разам з тым, да нашага часу захаваліся і тыя дамы, якія могуць і павінны стаць асновай гэтага, на мой погляд, агульнага комплексу, цікавай гістарычнай з'явы «Новы свет». Таму трэба вызначыць тое, што ні ў якім разе нельга зносіць. І вызначыць тыя межы, да якіх можна нешта перарабляць. Такім чынам, знайсці «кампраміс» паміж гістарычнымі каштоўнасцямі і нармальнымі ўмовамі жыцця. Улада павінна выпрацаваць нейкі алгарытм дзеянняў у гэтым пытанні. Каб людзі, якія пражываюць у гэтым раёне, не былі закладнікамі сітуацыі: з аднаго боку, кепскія ўмовы жыцця — трэба дом знесці, з іншага — не паляпшаем умовы жыцця, бо перспектыва — знос.

— Улады павінны заявіць, што «Новы свет» для Гародні важны, — лічыць Андрэй Чарнякевіч. — Мяркую, што на гэтым гарадзенскае самакіраванне можа стварыць свой імідж. Трэба не спрачацца з палякамі, маўляў, мы дамы зносім, а сказаць: «Не, вы памыляецеся, гэта для нас вельмі каштоўнае. Запрашаем вас да супрацоўніцтва».

На думку **гісторыка архітэктуры Ігара ТРУСАВА**, трэба ў рэшце рэшт вызначыцца, што з гэтай забудовы будзе так ці інакш разбурана (бо горад — гэта жывы арганізм), а што з'яўляецца архітэктурнай, гістарычнай каштоўнасцю. Затым вызеліць хоць бы частку найбольш цікавых і важных аб'ектаў і накіраваць адпаведныя дакументы ў рэспубліканскую навукова-метадычную раду па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры, каб узяць гэтыя аб'екты пад дзяржаўную ахову.

Дарэчы, Андрэй Чарнякевіч і яго калегі ўжо падрыхтавалі сваё бачанне каштоўнасці і перспектыў шэрагу будынкаў «Новага свету» і накіравалі гэтыя матэрыялы ў Міністэрства культуры. Адпаведныя даследаванні (каб угледзецца ў сітуацыю па самых розных параметрах, ацаніць умовы, каштоўнасць аб'ектаў і зрабіць нейкія высновы) па заказе гарвыканкама некалькі гадоў таму распачаў, але пакуль у поўным аб'ёме не выканаў, і інстытут «Гроднаграмадзянпраект». У пратаколе пасяджэння рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры (красавік 2007 года) на гэты конт сказана: «Звярнуць увагу заказчыка і праектнай арганізацыі на неабходнасць дэталёвага вывучэння забудовы 20—30-х гадоў XX стагоддзя з мэтай выяўлення традыцыйных і найбольш выразных у архітэктурна-мастацкім плане будынкаў... дзеля іх захавання і адаптацыі ў горадабудаўнічую тканіну... Рэкамендаваць разгледзець пытанне наконт стварэння адзінага квартала, які адлюстроўвае характэрныя рысы горадабудаўнічага асяроддзя 20—30-х гадоў XX стагоддзя».

Канкрэтных дзеянняў у гэтым кірунку пакуль няшмат, хоць іх важнасць і не аспрэчваецца.

— Да тэрыторыі, якая з поўначы прымыкае да цэнтральнай часткі горада, мы абавязаны ставіцца беражліва, бо гэта наш набытак па многіх параметрах, — кажа **начальнік упраўлення архітэктуры і горадабудаўніцтва Гродзенскага гарвыканкама Уладзімір АНІСІМАЎ.**

— Сёння ў нас нейкай працы па праектаванні будаўніцтва ў гэтым квартале не праводзіцца, і за апошнія два гады не прымалася ніводнага адпаведнага рашэння. Па меры інтэнсіўнасці асваення гэтых тэрыторый мы будзем углядацца і беражліва ставіцца да таго, што сапраўды з'яўляецца гістарычным набыткам. Будзем наводзіць парадак і з тым нязграбным, што таксама мае месца ў гэтым раёне.

— Ці існуюць, як сцвярджаецца ў польскай газеце, планы зносу каля двухсот будынкаў у гэтым квартале?

— Гэта домыслы, я такіх фактаў не ведаю.

— Наколькі мэтазгодна, на вашу думку, уключыць найбольш каштоўныя аб'екты гэтага раёна ў сістэму дзяржаўнай аховы?

— Для таго, каб уключаць, трэба дасканала вывучыць. І не выбарачна, а ў комплексе, па ўсіх параметрах. Таму будзем рабіць дэталёвы план гэтага раёна і тады дадзім комплексную ацэнку ўсяму.

Калі ж будзе такая ацэнка і сапраўднае жаданне, як сказана ў вышэйзгаданым пратаколе навукова-метадычнай рады Міністэрства культуры, захаваць і адаптаваць гэты раён у горадабудаўнічую тканіну, то будуць шукацца адпаведныя магчымасці і шляхі дзеянняў. У прыватнасці, можа быць карысным існуючы ў Еўропе вопыт захавання драўлянай гістарычнай забудовы (напрыклад, у Рызе, Юрмале, у Швецыі), яе арганічнага спалучэння з новымі архітэктурнымі тэндэнцыямі і сучаснымі матэрыяламі. Мо, ёсць чаму павучыцца і ў суседзяў з Падляскага ваяводства, дзе орган мясцовага самакіравання праводзіць конкурс сярод гаспадароў такіх драўляных дамоў з грашовым заахвочваннем тых, хто лепш за ўсё захоўвае аўтэнтычнасць будынка, і адпаведнай шыльдай на ім.

Мажліва, з'явяцца і варыянты забеспячэння іншым жыллём жыхароў асобных дамоў з перадачай апошніх новым уласнікам (зразумела, з умовай захавання гістарычных асаблівасцяў гэтых будынкаў) пад крамы і іншыя прадпрыемствы сферы абслугоўвання, культурныя ўстановы. Як гэта зроблена, напрыклад, па вуліцы Дзяржынскага, 10 у пабудаваным у 30-х гадах мінулага стагоддзя доме Вагнераў, дзе цяпер майстэрня і крама з сувенірамі *(на здымках)*.

Гісторык архітэктуры Ігар Трусаў звяртае ўвагу і яшчэ на адно прынцыповае пытанне:

— Бюджэт Мінска фарміруецца па мадэлі абласнога, а гэта азначае, што ў ім закладзеныя сродкі па артыкуле «Рэстаўрацыя помнікаў архітэктуры». Калісьці наш горад таксама меў права прафінансаваць нейкі праект па рэстаўрацыі. Аднак гэты артыкул, як і ўсім абласным цэнтрам, у 1990-я гады з бюджэту выключылі. Хоць, паверце мне на слова, толькі зарэгістраваных помнікаў архітэктуры ў Гродне ў дзясятку разоў больш, чым у сталіцы. І калі мы хочам па-сапраўднаму клапаціцца аб гістарычным цэнтры (ёсць нават задумы, каб ён увайшоў у спіс помнікаў ЮНЕСКА), то «рэстаўрацыйны» артыкул трэба вярнуць у бюджэт горада.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Спрэчны ліст

Вярнуць Лідзе карону 830-годдзя

Уладзімір КСЕНЗ

Думаю, што з 1980 года наш горад у «крыўдзе» на нас за тое, што яго амаладзілі на цэлых 200 гадоў. Ды і нашы продкі, там на нябёсах, глядзяць на нас з нямым пытаннем: мы што — не жылі, чаму нас выкраслілі з зямнога жыцця, прычым не адно пакаленне?

Гістарычная навука, археолагі не будуць спрачацца, што на тэрыторыі Лідскага раёна ў X—XII стагоддзях пражывалі дайноўцы, чарнарусы, ліцвіны — беларусы, крывічы. У гэты час тут размяшчалася Дайноўскае княства з цэнтрамі Дайнова, Жырмуны, Ліда. І другім цэнтрам пасля Дайновы была Ліда, якая пазней стала цэнтрам Дайноўскага княства, маю смеласць гэта сцвярджаць, і вось чаму.

Вядомыя даследчыкі Літвы Нарбут і Юшкевіч у сваіх працах зазначалі, што Ліда ўпершыню ўзгадваецца ў летапісах у 1180 годзе. Абапіраліся яны на архіўную перапіску графа Тызенгаўзена, які ў каралеўскім архіве Панятоўскага знайшоў дакументы, дзе ўзгадваецца наш горад. З іх зрабіў копію і даслаў у Ліду. Гэтая выпіска была зроблена з візантыйскай крыніцы, і можна сказаць, з'яўлялася своеасаблівым пашпартам нашага горада. Захоўвалася яна ў архівах нашага замка, які быў вывезены ў 1812 годзе ў Маскву, дзе і згарэў падчас уваходжання Напалеона ў Маскву.

Графы Еўстафій і Канстанцін Тышкевічы таксама сцвярджалі, што Ліда была цэнтрам Дайноўскага княства ў XII—XIII стагоддзях і мела ўсе атрыбуты княскай стаўкі з умацаваным драўляным замкам. Пазней на месцы старога драўлянага замка быў пабудаваны каменны замак Гедыміна, які мы бачым цяпер. Спасылаліся яны зноў на Тызенгаўзена і дакументы князя Чартарыйскага, які атрымаў іх ад Сперанскага — міністра пры Аляксандры І. Сперанскі курыраваў працу Карамзіна па напісанні гісторыі Расійскай дзяржавы. Усё, што не ўкладалася ў рэчышча палітыкі Масквы—Пецярбурга, замоўчвалася ці знішчалася.

Размова вядзецца аб працы Тацішчава за XVIII стагоддзе, дзе гэты гісторык спасылкай на старажытныя дакументы паказаў існаванне двух цэнтраў Русі: Літвы і Масквы. Паводле Тацішчава, прарадзіма славян аказалася на тэрыторыі Літвы і Белай Русі, а не ў Ноўгарадзе і Кіеве, а гэта ішло ўразрэз з палітыкай Расійскай імперыі. Сперанскі перадаў Чартарыйскаму шэраг дакументаў, якія належалі Тацішчаву.

Яшчэ ў 1971 годзе я ўпершыню пачуў ад свайго настаўніка, дырэктара школы Мікалая Івашына (хто вучыўся ў першай школе ў тыя гады, памятаюць, наколькі добра і аб'ёмна гэты чалавек ведаў гісторыю), што дата заснавання нашага горада — 1180 год, пры гэтым ён спасылаўся на крыніцы варагаў у Стакгольме і на Тацішчава... У 1989 годзе практычна падобны варыянт аб узгадванні Ліды я пачуў ад пісьменніка Валянціна Пікуля, які расказваў мне пра князя Міндоўга і залаты абоз татарскіх ханаў Шэйбака і Баклая, якіх разбіў Міндоўг, пра гэта я раней пісаў у «Звяздзе» ў матэрыяле «Беларускі залаты трохкутнік». Пікуль тады сцвярджаў, што Міндоўг быў Дайноўскім князем на рэках Віліі і Жыжме і быў нашчадкам кляскага роду Рагвалодавічаў.

Візантыйцы апісвалі пасольства шведскага канунга, якія прыбылі на перамовы з імператарам Візантыі ў 1180 годзе. Акрамя дзяржаўных пытанняў варагі-русы прасілі ў кесара-нашчадка дапамагчы ім у адной справе: па дарозе ў Канстанцінопаль яны спыняліся і гасцявалі ў Дайноўскага князя на рацэ Віліі, у гарадах княства Жырмунах і Лідзе. Прымаў іх князь Давід з малалетнім князем Рынгольдам у Лідзе. Давід прасіў варагаў знайсці яго брата, калі той жывы, і яго дзяцей. Плату ён за гэта даў вялікую і прыставіў да пасольства сваіх людзей у дапамогу. Ён расказваў, што ў Лідзе і Дайнове ён у малалецтве аказаўся са сваім дзядзькам князем Маўкольдам у 1128 годзе, калі кіеўскі князь Мсціслаў Уладзіміравіч разбіў і ўзяў у палон яго вотчыну горад Полацк. Дзядзьку і яму ўдалося збегчы з палону, бо іх замянілі надзейныя людзі. Князя Расціслава полацкага, брата яго Давіла з сынам, сем'і іх Мсціслаў адправіў у Канстанцінопаль у палон. Вось Давід і шукаў свайго бацьку Давіла і брата.

Маю смеласць падумаць, што Тызенгаўзен менавіта з гэтага дакумента здымаў копію, дзе Ліда ўзгадваецца ў 1180 годзе.

Міндоўг быў жа сынам Рынгольда, які ўзгадваецца ў візантыйскіх крыніцах.

Шкада, што многія працы і дакументы графоў Тышкевічаў згарэлі падчас Другой сусветнай вайны.

Думаю і ўпэўнены, што знойдзецца больш за тысячу чалавек, якія пастаянна жывуць у Лідзе, якія пацвердзяць мае словы, што да 1980 года на слупах, што стаялі пры ўездзе ў наш горад, датай заснавання Ліды называўся 1180 год. Дык, чаму ж у 1980 годзе наш горад «амаладзілі» на цэлых 200 гадоў? Можа палічылі, што нейкая Ліда ледзь-ледзь не дацягвае да 800-годдзя Белакаменнай (1147), а гэта абуральна!..

Лічу і прапаноўваю ўсім светам вярнуць нашаму гораду страчаныя гады і адзначыць сёлета 830-годдзе Ліды.

г. Ліда.

Фота Пятра ФАМІНА.

Дык колькі гадоў Лідзе?

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ

Калі прыйшоў гэты ліст, першае банальнае журналісцкае ўражанне: «запахла смаленым». Насамрэч, да 1980 года датай заснавання Ліды лічыўся 1180 год. Сапраўды цікава, чаму горад стаў «маладзейшым», тым больш, што ў дачыненні да населеных пунктаў больш характэрна прыплюсоўваць узрост. Але шмат з таго, што змешчана ў тэксце аўтара, насцярожвае, дакументы, на якія ён спасылаецца, не захаваліся. Між іншым дата, устаноўленая ў васьмідзясятых гадах мінулага стагоддзя, з якой адлічвалася гісторыя Ліды (1180), літаральна пару гадоў была зменена на 1323. Дык колькі зараз гадоў гэтаму гораду? Каб разабрацца з гэтым, я звярнулася па дапамогу да навукоўцаў.

Супрацоўнікі Лідскага гісторыка-мастацкага музея мяркуюць, што годам нараджэння горада трэба лічыць 1323-і, калі тут пачалося будаўніцтва замка вялікім князем Гедымінам, тым больш што пытанне пра дату, з якой трэба адлічваць гісторыю горада, неаднойчы ўзнімалася, праведзены сур'ёзныя даследаванні. «Сёння няма крыніц, якія могуць пацвердзіць, што першыя згадкі пра горад адносяцца да 1180 года, археалагічныя раскопкі, што праводзіліся ў сямідзясятых—васьмідзясятых гадах, таксама не пацвярджаюць гэтага», — заўважае супрацоўнік музея Настасся Каладзяжная. Яна падказала, што пытанню наконт заснавання Ліды прысвечаны артыкул у часопісе «Лідскі летапісец», № 1 за 1997 год. Ужо не першы год вядуцца спрэчкі наконт даты, якую трэба браць за пункт адліку гісторыі горада. Лічбы 1180 прытрымліваўся дарэвалюцыйны гісторык Міхаіл Шымялевіч, які меркаваў, што людзі абжылі гэту тэрыторыю яшчэ ў X стагоддзі, тут існавала пасяленне, характэрнае для племені яцвягаў, якія засялялі Панямонне ў X—XIII стагоддзях. Летапісы ўзгадваюць 1283 год, калі існавала Дайноўскае княства, якое размясцілася на землях Лідчыны ў XII—XIII стагоддзях і цэнтрам якога была вёска Дайнова (якая існуе і цяпер).

Самая старажытная дата з'яўлення Ліды была змешчана ў Польскай вялікай усеагульнай энцыклапедыі, том 6. З'явілася гэта дата дзякуючы двухсэнсавай фразе вядомага польскага гісторыка XIX стагоддзя, жыхара Лідскага павета Тэадора Нарбута. Да пятага тома свайго вялікага дзевяцітомнага даследавання па гісторыі Літоўскага княства Т. Нарбут дадаў невялікае сачыненне на чатыры старонкі «Крыху з гісторыі горада Ліды», якое пачынаецца так: «Гэтае месца пасля заваёвы княства Дайноўскага каля 1180 года, у якім размяшчалася, ёсць паселішча Літоўскае». Неканкрэтнае па сэнсе меркаванне з цягам часу ператварылася ў перакананне, што Ліда была заснаваная ў гэтым годзе, і падтрымліваецца сучаснымі літоўскімі энцыклапедыямі.

Яшчэ адна дата, звязаная з гісторыяй горада, узгадваецца ў гісторыка-эканамічным нарысе «Ліда», які быў надрукаваны ў 1976 годзе. Там напісана пра нашэсце татар, што «ў 1242 годзе літоўскі князь Міндоўг адбіў іх напад ля Ліды». Але аўтар нарыса, не паведаміў пра першакрыніцу, з якой узятыя гэтыя звесткі, і таму іх немагчыма праверыць. У 1242 годзе татарскія плямёны ўварваліся ў Панямонне, але пад Васілішкамі пацярпелі паражэнне, і іх кіраўнік Шайбак-хан быў забіты (захаваліся назвы Шайбак-поле і вёска Шайбакі).

Але большасць гісторыкаў прытрымліваецца даты 1323, калі тут пачалося будаўніцтва Лідскага замка. Дата гэта называецца і Тэадорам Нарбутам, які піша, што ў гэтым годзе быў закладзены замак. У 1341 годзе Гедымін памёр, але ў пастаменце, які ён пакінуў, апісваецца, што ён завяшчае сваім сынам. Там узгадваюцца 15 гарадоў, сярод якіх і Ліда (менавіта горад, а не замак).

У 1980 годзе, калі многія гарады святкавалі юбілеі, кіраўніцтва Ліды таксама вырашыла зрабіць вялікае свята. Калі савецкая сістэма трашчала, меркавалася, што гэта будзе штуршком для развіцця горада. Дату 1380 прапанаваў Аляксандр П'янкоў — адзін з аўтараў гісторыі Беларускай ССР, выдадзенай у Мінску ў 1961 годзе, якая пасля была прадубляваная беларускімі энцыклапедыямі.

Супрацоўнікі Інстытута гісторыі Акадэміі навук таксама ўпэўненыя, што гісторыя Ліды пачынаецца з моманту будаўніцтва замка Гедымінам у 1323 годзе. Па-першае, гэта дакладна вядомая дата. Па-другое, гісторыя многіх гарадоў так і пачыналася, стваралася абарончае збудаванне — і там узнікаў горад. Прапановы ад людзей, якія хочуць зрабіць свае гарады больш старажытнымі, даволі часта паступаюць навукоўцам. Але ці трэба зрушваць ужо вызначаныя даты? Звычайна сваю гісторыю гарады пачынаюць з даты, упершыню ўзгаданай у летапісах. Але нават пры такім раскладзе нельга сказаць, што горад не існаваў яшчэ да таго, як з'явіліся першыя дакументальныя пацвярджэнні таму. І пры жаданні можна састарыць шмат населеных пунктаў Беларусі, напрыклад, калі становіцца вядомым, што на пэўнай тэрыторыі раней існавала нейкае пасяленне. «Напэўна, гэта не зусім карэктна пачынаць гісторыю горада з тых часоў, калі з'яўляюцца першыя звесткі пра людзей, што сяліліся на пэўнай тэрыторыі», — мяркуе **гісторык Марат КЛІМАЎ**. А што думаюць нашы чытачы?

Павел ЛАТУШКА:

«НА ФІЛЬМ «ДНЯПРОЎСКІ РУБЕЖ» ПАТРАЧАНА Br6 МІЛЬЯРДАЎ, ВЕРНУТА — 100 МІЛЬЁНАЎ...»

....ПРА ДАСЯГНЕННІ

— 2009 год быў багаты на падзеі і культурныя дасягненні. Сярод іх — увод у дзеянне пасля капітальнага рамонту Вялікага тэатра оперы і балета, працяг рэканструкцыі помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны — палацава-паркавага комплексу ў Нясвіжы і замкавага ў Міры, адкрыццё новых устаноў культуры. У тым ліку двух музеяў, дзесяці бібліятэк, трыццаці сямі новых тыпаў клубных устаноў у аграгарадках. Праведзеныя на высокім міжнародным узроўні фестывалі — «Славянскі базар» у Віцебску, кінафестываль «Лістапад», форум тэатральнага мастацтва «Панарама» ў Мінску, «Залаты шлягер» у Магілёве... Новым творчым праектам з'явіўся рэспубліканскі конкурс «Зорка ўзышла над Беларуссю», першы этап якога паспяхова прайшоў у гарадах і раёнах краіны. Летась быў рэалізаваны шэраг важных культурных праектаў. Праведзены год культуры Расіі, дні культуры Кітая, у Маскве праведзены дні культуры Беларусі. Падпісаны міжурадавыя і міжведамасныя пагадненні аб культурным супрацоўніцтве з Францыяй — дарэчы, некалькі дзён таму — з дзяржавай Катар, Літвой, Туркменістанам. Падпісаная праграма Года культуры Беларусі ў Расіі. Падрыхтаваныя да падпісання дакументы аб супрацоўніцтве з Італіяй, Грэцыяй, Польшчай і Украінай.

...ПРА НЕДАПРАЦОЎКІ

— ...Аднак існуюць і недапрацаваныя моманты. Германавіцкі музей культуры і побыту з унікальнай калекцыяй Язэпа Драздовіча не мае фондасховішча і памяшкання для працы супрацоўнікаў. На Брэстчыне патрабуюць капітальнага рамонту будынкі абласнога краязнаўчага музея, адміністрацыйны будынак філіяла «Камянецкая вежа», Музей беларускага Палесся, Івацэвіцкі краязнаўчы музей... Неабходна пабудаваць фондасховішча ў Музеі гісторыі Брэста, Мотальскім музеі, пашырыць фондасховішча ў Ганцавіцкім краязнаўчым музеі...

...ПРА АХОВУ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

— На працягу мінулага года 124 адзінкамі папоўніўся Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў — і цяпер ён налічвае 4911 значных аб'ектаў. Неабходна падкрэсліць, што пры рэстаўрацыйна-аднаўленчых работах на гісторыка-культурных каштоўнасцях асаблівая ўвага павінна надавацца безумоўнаму захаванню аўтэнтычнасці элементаў і канструкцый помнікаў архітэктуры. Нельга пад выглядам рэстаўрацыі займацца будаўніцтвам! Вынікі нашай працы па рэстаўрацыі гісторыка-культурных каштоўнасцяў будуць ацэньвацца не толькі намі, але і нашымі нашчадкамі. Неабходна на аб'ектах забяспечваць высокую ступень узаемадзеяння заказчыка, падрадчыка і навуковага кіраўніка на ўсіх этапах праектавання і рэстаўрацыі. Ад Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў найбліжэйшы час чакаю канкрэтных прапаноў па аднаўленні вертыкалі па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Прашу прапрацаваць унясенне адпаведных зменаў у нарматыўна-прававую базу. Спадзяюся на актывізацыю адпаведнай працы з боку ўпраўленняў культуры аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама, раённых аддзелаў культуры. ...Апроч дзяржаўнага фінансавання неабходна шукаць іншыя крыніцы. Гэта могуць быць сродкі прыватных — як беларускіх, так і замежных — інвестараў, а таксама выхадцаў са славутых родаў. Мы павінны прапанаваць зацікаўленым набыццё маёнткаў, сядзібаў пры ўмове іх рэстаўрацыі з навуковым наглядам міністэрства.

...ПРА ХРУЦКАГА І ЛУЎР

— Неабходна працягваць працу па далейшым развіцці супрацоўніцтва з музеямі замежжа. Мы спадзяёмся, што важным вынікам дамовы аб супрацоўніцтве Нацыянальнага мастацкага музея з сусветна вядомым музеем Луўр стане арганізацыя на працягу гэтага года шэрагу сумесных праектаў, сярод якіх выстава ў Парыжы да 200-годдзя беларускага мастака Хруцкага.

...ПРА НЕТРАДЫЦЫЙНЫЯ СРОДКІ ЗАВАБЛІВАННЯ НАВЕДНІКАЎ

— ...У якасці прыкладу можна прывесці ўвядзенне пячатак Мірскага і Нясвіжскага замкаў, экскурсію з факеламі па Нясвіжскім падземным ходзе, канцэрты і спектаклі каля сценаў Нясвіжскага замка, выстава адной карціны па замове аднаго наведніка і іншае. Такіх ідэй можа быць шмат — трэба актыўней аналізаваць і пераймаць досвед расійскіх і еўрапейскіх музеяў.

...ПРА БІБЛІОБУСЫ

— Як вядома, кожны другі жыхар краіны з'яўляецца карыстальнікам публічных бібліятэк. Аднак сетка бібліятэк мае пэўную тэндэнцыю да скарачэння: зачыняюцца сельскія бібліятэкі ў маланаселеных пунктах... Выйсцем з гэтага становішча павінна стаць далейшае развіццё нестацыянарных пунктаў абслугоўвання, і ў першую чаргу — бібліобусаў.

...ПРА ІНТЭРНЭТ У БІБЛІЯТЭКАХ

— Сёння ў краіне камп'ютарызавана 32 % дзяржаўных публічных бібліятэк. Ад агульнай колькасці цэнтральных бібліятэк больш за 70 % маюць свае інтэрнэт-старонкі. Новым падыходам павінна стаць забеспячэнне ў кожнай бібліятэцы магчымасці доступу ў інтэрнэт. Што, перакананы, дазволіць адначасова больш шырока прыцягваць моладзь да карыстання кніжнымі фондамі бібліятэк. Гэта тым больш істотна з улікам таго, што яшчэ 14 % бібліятэк наогул не тэлефанізаваныя!

...ПРА ДОЛЮ БЕЛАРУСКІХ СПЕКТАКЛЯЎ

— Істотнай праблемай для тэатраў з'яўляецца адсутнасць пастановак сучасных аўтараў. Доля беларускай драматургіі ў рэпертуарах тэатраў ледзьве дасягае 25 %! Гэта супярэчыць прыярытэтам развіцця нацыянальнай культуры. Міністэрствам будуць прыкладзеныя намаганні, каб выправіць гэтае становішча. Кожны тэатр павінен будзе надаваць адпаведную ўвагу гэтаму пытанню і ўнесці прапановы па канкрэтных дзеяннях.

...ПРА РАЗЛІКІ З МАСТАКАМІ

— Міністэрства ў 2009 годзе разлічылася з усімі мастакамі, творы якіх, пачынаючы з 2004 года, былі рэкамендаваныя для набыцця. Летась набыта твораў на суму каля 700 мільёнаў рублёў. Гэта рэкордная сума за апошнія 10 гадоў.

...ПРА КІНО

— У мінулым годзе мы адзначылі 85-годдзе беларускага кіно. Мы ганарымся тым, што зроблена за мінулыя гады. Але час не стаіць на месцы. Сусветная кінавытворчасць ідзе наперад — а значыць, і мы, калі хочам быць канкурэнтаздольнымі, павінны ісці далей. Весці разумную жанравую і актыўную маркетынгавую палітыку. Эканамічны эфект вытворчасці мастацкіх стужак пакуль не ўсцешвае. Як прыклад — «Дняпроўскі рубеж». Выдаткі на вытворчасць — 6 мільярдаў рублёў дзяржаўных сродкаў. Выручаная сума з нацыянальнага паказу склала 100 мільёнаў рублёў (у 60 разоў менш! — **Аўт.**).

...ПРА СТУДЭНТАЎ-КІНОШНІКАЎ

— Мы часта гаворым пра неабходнасць падрыхтоўкі высокакваліфікаваных прафесійных кадраў для кіно. І гэтую задачу мы павінны вырашыць. У тым ліку — праз стварэнне факультэта экранных мастацтваў у Акадэміі мастацтваў. Але мы павінны звярнуць увагу і на тое, што ляжыць на паверхні: каля 60 грамадзянаў Беларусі з'яўляюцца студэнтамі Маскоўскага і Санкт-Пецярбургскага інстытутаў кіно. Трэба зацікавіць іх вяртацца на працу ў Беларусь. Наспеў час адзначыць неабходнасць адпаведнага фінансавання для выезду на стажыроўкі і вучобу студэнтаў па спецыяльнасці «кіно» ў еўрапейскія краіны.

...ПРА КУЛЬТУРНУЮ СТАЛІЦУ ГОДА

— Важнай грамадска-культурнай падзеяй павінен стаць праект «Культурная сталіца года». Сімвалічна, што ён распачаўся ў Полацку — сталіцы старажытнага княства, адкуль бярэ вытокі беларуская дзяржаўнасць і культура. У будучыні на гэтае званне змогуць прэтэндаваць іншыя гарады — што дазволіць нам узбагаціць культурную палітру, актывізаваць мясцовыя ініцыятывы і стварыць шырокія ўмовы для даступнасці найлепшых здабыткаў нацыянальнай культуры мясцовым жыхарам.

...ПРА КРАІНУ ЗАМКАЎ

— Нам неабходна працаваць над стварэннем культурна-турыстычных брэндаў краіны, якія маглі б яскрава і дакладна прадстаўляць нашу краіну за мяжой. У якасці прапановы можна прывесці пазіцыяванне брэнда «Беларусь — краіна замкаў».

...ПРА ПАМЯТНЫЯ ДАТЫ

— Важная дата гэтага года — 65-годдзе вялікай Перамогі, святой для кожнага беларуса. Памятаючы наша гістарычнае мінулае, мы павінны годна адзначыць 600-годдзе Грунвальдскай бітвы. Мы правядзём шэраг мерапрыемстваў да 80-годдзя Уладзіміра Караткевіча. Важнай справай павінна стаць усталяванне помніка Караткевічу ў Кіеве.

...ПРА ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

Сёння мы працуем над надзвычай актуальнай праблемай — аднаўленнем дзейнасці Інстытута культуры Беларусі. Інстытут павінен заняцца навукова-метадычным забеспячэннем сферы культуры, распрацоўкай стратэгіі развіцця, больш актыўна прасоўваць беларускую культуру за мяжу. ...Будзе актывізавана праца па пашырэнні супрацоўніцтва з беларусамі замежжа. Міністэрства плануе працягнуць дзейнасць, скіраваную на развіццё супрацоўніцтва ў галіне культуры з суседнімі краінамі, краінамі — стратэгічнымі партнёрамі, і ў межах ініцыятывы Еўрасаюза «Усходняе партнёрства» — з выкарыстаннем дадатковых фінансавых магчымасцяў.

...ПРА МОВУ

— Абсалютна натуральным асяроддзем для пашырэння выкарыстання беларускай мовы з'яўляецца наша сфера — сфера культуры. Пры гэтым важна падкрэсліць, што ў гэтай справе недапушчальным з'яўляецца прымус. Гэта павінен быць шлях усведамлення патрэбы захавання нашай мовы. Як падкрэсліў народны пісьменнік Беларусі Іван Мележ: «Мова — гэта вялікая народная скарбніца, яе нельга не паважаць, як нельга не паважаць родны народ».

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота аўтара.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

СЯБАР — НА СЛОВАХ

Ну і ну!

Калі два маладыя чалавекі, якія сябравалі, прыйшлі па дапамогу ў сталічную міліцыю, высвятлілася, што адзін з іх пацярпеў ад рук другога...

Паводле звестак прэс-афіцэра Савецкага РУУС Вольгі Яскевіч, два маладыя чалавекі адпачывалі ў забаўляльнай установе, калі іх вяселле раптоўна азмрочыла знікненне мабільнага тэлефона: сумесныя пошукі на месцы здарэння выніку не далі, таму пацярпелы разам з сябрам і накіраваліся да праваахоўнікаў. Адметна, што супрацоўнікам міліцыі пра крадзеж падрабязна распавядаў не гаспадар зніклага апарата, а яго сябар. Зрэшты, апошняга давялося абарваць на паўслове, таму што служба бяспекі клуба, дзе адпачывалі маладыя людзі, перадала ў распараджэнне міліцыі запіс з камеры відэаназірання. Для пацярпелага гэтая стужка стала сапраўднай «бомбай»: на ёй было дакладна бачна, што мабільны тэлефон з руказака гаспадара выцягнуў... яго ж сябра, які пасля вельмі старанна дапамагаў шукаць зніклы апарат. Між іншым, 22-гадовы жыхар сталіцы, у дачыненні якога ўзбуджана крымінальная справа, раней ужо прыцягваўся да крымінальнай адказнасці.

Ігар ГРЫШЫН.